*Г. В. ЛАХОЎСКАЯ*

# ВАДЗЯНІК ЯК ПЕРСАНАЖ БЕЛАРУСКАЙ І ЧЭШСКАЙ МІФАЛОГІІ

Розныя міфалагічныя сістэмы даюць багаты матэрыял для кампаратывістычнага аналізу; асабліва цікавыя вынікі дае аналіз міфалагічных сістэм краін, якія знаходзяцца на перакрыжаванні культур Усходу і Захаду і, адпаведна, маюць у аснове не толькі сваю, мясцовую традыцыю, але і з'явы, уласцівыя для суседніх народаў.

У дадзенай працы прадстаўлены кампаратывістычны аналіз Вадзяніка як персанажа ў беларускай (далей — Вадзянік) і чэшскай (далей — Воднік) міфалогіі. Выбар менавіта гэтага міфалагічнага персанажа абумоўлены яго папулярнасцю і вядомасцю ў абедзвюх краінах, што дае вялікі і разнастайны шэраг крыніц; апроч таго, Вадзянік з'яўляецца адным з нешматлікіх персанажаў, чыё існаванне і месца ў міфалагічнай карціне свету славян не аспрэчваецца вучонымі.

Для кампаратывістычнага аналізу была часткова выкарыстана «Схема апісання міфалагічных персанажаў» [2].

***Імёны, інтэпрэтацыі.*** Вадзянік, Вадзяны, Вадзяны дзед / Vodník, Hastrman, Wassermann, Vosermon, Mužíček.

***Іпастасі.*** Вадзянік характарызуецца як антрапаморфная істота з некаторымі зааморфнымі (перапонка паміж рук), а таксама фітаморфнымі рысамі (на сушы ператвараецца ў клубок водарасцяў, абцягнуты плёнкай); Воднік таксама антрапаморфны, у рэдкіх выпадках з зааморфнымі рысамі (перапонка паміж пальцамі рук і ног).

***Характарыстыка знешнасці.*** Беларускі персанаж — істота мужчынскага полу, стары, нацыянальнасці і прафесіі не мае. Цела тоўстае, азызлае, рыхлае і непрапарцыянальнае. Паміж пальцамі рук ёсць перапонкі. Па ўсім целе растуць доўгія валасы, якія насамрэч з'яўляюцца струменямі вады ці тонкімі водарасцямі. Адзенне і абутак адсутнічаюць.

Воднік — гэта малады альбо сталы мужчына, можа з'яўляцца да людзей як прадстаўнік розных прафесій. Мае зялёную і заўжды ледзяную скуру, вялікія вочы, перапонкі на руках і зрэдку на нагах. Адзенне і абутак: фрак, паліто, чырвоныя боцікі, пояс з травы, капялюш.

***Атрыбуты, спадарожнікі.*** Вадзянік ездзіць на соме, як на кані. Воднік мае палку з павязанымі на ёй яскравымі стужкамі, якой ён прываблівае дзяцей.

***Узаемаадносіны міфалагічных персанажаў.*** У беларускай міфалагічнай сістэме Вадзянікоў падзяляюць на дзве групы: *вірнікі* (жывуць у праточнай, хуткаплыннай вадзе, вірах) і *ціхоні* (жывуць у спакойнай, стаячай вадзе). Усе яны бяруць у наложніцы *русалак* (дзяўчат-тапельніц) альбо *ва-*

*дзяніц* (пачварных вадзяных баб). І русалкі, і вадзяніцы моцна залежаць ад Вадзяніка (пры ягонай гібелі гінуць і яны) і фактычна знаходзяцца ў рабстве. Дзеці — *вадзяняты*, да паўналецця не дажываюць (гінуць альбо іх забіваюць бацькі). Чэшскі ж Воднік топіць прыгожых дзяўчат і прымушае іх даглядаць сваю падводную гаспадарку.

***Генезіс.*** Нябеснае паходжанне (познія апакрыфічныя паданні): Вадзянік-Воднік апісваўся як анёл, які за непаслухмянасць і адмаўленне аўтарытэта Бога быў скінуты з нябёсаў у ваду.

***Месца пражывання.*** Вадзянік можа існаваць у любой воднай прасторы: возеры, рацэ, затоне, студні, а таксама пад млыном. Пад вадой мае незвычайнай прыгажосці палац. Воднік жа не пераносіць толькі марской вады; мае сваё жытло, адметны элемент якога — паліцы з гаршчочкамі, перакуленымі ўверх донцам. У такіх гаршчочках Воднік трымае душы тапельцаў.

***Час функцыянавання, актывізацыі, з'яўлення, знікнення, наведвання людзей.*** Беларусам трэба сцерагчыся Вадзяніка найбольш апоўдні і апоўначы. Чэшскі ж Воднік актыўны ва ўсе дні тыдня, акрамя пятніцы (у гэты дзень ён не палюе на душы). З'яўляецца звычайна паміж палуднем і першай гадзінай дня. Святам Воднікаў лічыўся дзень святога Пракопа.

***Уласнасці, здольнасці, прыхільнасці.*** Па характары беларускі Вадзянік няўрымслівы, жорсткі, ён схільны да злой жартаўлівасці, часта бывае ўгневаным і помслівым. Можа ператварацца ў любую рыбу. Схільны збіраць толькі «чыстыя душы» праведнікаў, трупы грэшнікаў Вадзянік без жалю выкідвае на паверхню. Чэшскі Воднік можа ператварацца ў любую рыбу ці жывёлу (найчасцей у каня, жабу, трусіка). Мае такія ж звычкі, як і людзі вакол яго: любіць смаліць, танцаваць, наведваць кірмашы, шынкі. Характар у розных крыніцах апісаны па-рознаму.

***Характэрныя заняткі, дзеянні, звычкі.*** Вадзянік пераймае галасы жывёл і птушак. Страшна рагоча, пляскае ў далоні ці далонямі па вадзе. Асноўны характар заняткаў — дэструктыўны: пудзіць і топіць купальшчыкаў, ломіць плаціны і млыны, рве нераты.

У вадзе Воднік рагоча, крычыць, пляскае ў далоні. Яго прысутнасць на кірмашы заўжды можна пазнаць па добрым гандлі і вялікім прыбытку. У вольны час Воднік сам шые сабе боты са скуры патопленай скаціны; разводзіць рыбу, разбівае прыгожыя падводныя сады, глядзіць за чысцінёй вады. У пятніцу сядзіць на дрэве і прычэсвае свае доўгія зялёныя валасы.

***Функцыі і прэдыкаты (дзеянні, заснаваныя на кантакце з аб'ектам).*** Вадзянік можа шкодзіць, дапамагаць (пры выратаванні ад гібелі альбо пры заключэнні дамовы), уздзейнічаць на рыбу; апроч таго, пужае, катуе, знішчае, псуе, забівае (топіць) і здзекуецца з трупа; пудзіць рыбу, рве нераты, ломіць млыны і плаціны, топіць людзей і скаціну, душу тапельца забірае на службу; дапамагае разбагацець, дорыць удачу і не дае патануць тым, хто калісьці яго выратаваў.

Воднік шкодзіць, дапамагае, карае (тых, хто яго абразіў); таксама вабіць (каляровымі стужкамі), пужае, катуе (сцябае), душыць, топіць. Стасуецца з людзьмі як звычайны чалавек (ходзіць у шынок, на танцы, кірмаш).

***Аб'екты, адрасаты і рэцыпіенты.*** Вадзянік мае шырэйшае кола ўздзеяння: гэта купальшчыкі; млынары (не тонуць, бо заключылі кантракт), рыбакі, пчаляры, душы тапельцаў; вада, рыба і мелкія водныя жывёлы; млынарскае кола. Чэшскі Воднік уздзейнічае на купальшчыкаў, душы тапельцаў, ваду і ўсё, што ў ёй знаходзіцца; ускосна дзейнічае на гандаль (станоўча). Па павер'ях, можа ўтапіць толькі таго, каму гэта наканавана лёсам.

***Камунікацыя з міфалагічным персанажам.*** У адрозненне ад Чэхіі, на Беларусі было зафіксавана шмат выпадкаў «заключэння дамовы» з Вадзянікам і ахвярапрынашэнняў яму: першы рыбацкі ўлоў, жывая курыца, певень, гусь, сцягно свінні альбо цэлае парася, сала, кабыла, нават чалавечыя ахвяры.

Спосабы распазнавання Вадзяніка — бурбалкі, непрамерзлая вада, моцныя паводкі («Вадзянік праўляе вяселле»). Самы ж надзейны спосаб распазнаць Водніка — паглядзець на крысо яго пінжака: з яго ўвесь час капае вада.

***Ахоўныя дзеянні і спосабы нейтралізацыі.*** Вадзянікі не могуць перамяшчацца па сушы і не пераносяць іншай вады, таму пры злучэнні двух вадаёмаў абодва гінуць. Вадзянік таксама забіваўся свістам і попелам.

Сілу Водніка-каня можна адабраць, спутаўшы яго лыкам (але як толькі конь дакранецца да вады, сіла вяртаецца). Воднік не баіцца малітвы, крыжа і ружанца; адолець яго можна толькі двойчы апечаным хлебам, цёртым часнаком і папараццю з палыном. Перад уваходам у ваду трэба тройчы пераскагнацца.

***Забароненыя дзеянні*** агульныя для беларускага і чэшскага персанажа. Тапельца і скаціну не ратуюць, бо моцна баяцца ўгнявіць Вадзяніка.

Такім чынам, беларускі Вадзянік захаваўся ў народнай свядомасці як моцны дух вады, з якім сапраўды трэба лічыцца, якога трэба паважаць, шанаваць і ўлагоджваць. Вобраз беларускага Вадзяніка захаваўся як дух прыроды, прывязаны да пэўнага месца (неаддзельны ад уласнай вады). Чэшскі Воднік як дух прыроды перажыў пэўную трансфармацыю: ён перастаў мець прывязку да канкрэтнай воднай прасторы, атрымаўшы магчымасць свабодна перасоўвацца па сушы.

## Літаратура

1. *Богданович А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов. Этнографический очерк. — Гродно, 1895.

2. *Виноградова Л. Н.*, *Толстая С. М.* Схема описания мифологических персонажей // Материалы к VI Международному конгрессу по изучению стран Юго-Восточной Европы. София, 30.VIII.89–6.IX.89. Проблемы культуры. — Москва, 1989. — С. 78–86.

3. *Добровольский В.* Нечистая сила в народных верованиях. — Санкт-Петербург, 1908.

4. *Ненадавец А. М.* Нарысы беларускай міфалогіі. — Мінск, 2013.
5. *Никифоровский Н. Я.* Нечистики. Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. — Вильня, 1907.
6. *Grohmann J.* V. Pověry a obyčeje v Čechách a na Moravě. — Praha, 2010.
7. *Juránek R.* Brněnská strašidla. — Brno, 2008.
8. *Polášek J.*, *Polášková J.* Pověsti a legendy Moravy a Slezska. — Český Těšín, 1997.
9. *Váchal J.* Ďáblova zahrádka aneb Přírodopis strašidel. — Praha, 2012.